**22 сакавіка 2025 г. – 80 гадоў з дня нараджэння Івана Паўлавіча Мароза (1945), ветэрана працы, кіраўніка вытворчасці, Ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна (2015)**



Мароз Іван Паўлавіч нарадзіўся 22 сакавіка 1945 года ў вёсцы Свішчы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Бацька – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, франтавік. У дзяцінстве ў Івана праявілася цікавасць да механікі, таму пасля заканчэння сямігодкі ў 1961 годзе ён вырашыў пайсці вучыцца ў Пружанскі саўгас-тэхнікум. Скончыў аддзяленне механізацыі, атрымаў спецыяльнасць тэхніка-механіка.

Працоўную дзейнасць Іван Мароз пачаў у 1966 годзе на Кобрынскім рамонтным заводзе, куды па размеркаванні быў накіраваны на работу. 22 гады аддаў прадпрыемству, дзе паступова прайшоў усе прафесійныя прыступкі – ад майстра да намесніка дырэктара па вытворчасці, набіраўся прафесійнага вопыту і вопыту работы з людзьмі.

З 1979 года па 1985 год Іван Мароз сумяшчаў кіруючую работу на вытворчасці з вучобай на завочным аддзяленні Беларускага дзяржаўнага політэхнічнага інстытута. Скончыў аўтатрактарны факультэт і ўжо праз год вопытнага спецыяліста прызначаюць дырэктарам Кобрынскай сельгастэхнікі (з 1996 года – ААТ «Кобрынская сельгастэхніка», з 2003 года – ААТ «Кобрынаграмаш»). Сельгастэхніка – вялізная частка жыцця Івана Паўлавіча. Прыйшоў ён туды ў савецкія часы, быў з ёй падчас росквіту, у складаны перыяд распаду СССР і ў цяжкія 1990-я, асвойваў новыя сучасныя формы працы ў 2000-х. 28 гадоў (па жнівень 2014 года) І. П. Мароз кіраваў прадпрыемствам з колькасцю работнікаў каля 750 чалавек.

Нават у самыя складаныя часы І. П. Мароз даражыў кожным здольным спецыялістам і не толькі не дапусціў масавых звальненняў, але і стварыў новыя рабочыя месцы, укараняў са сваімі калегамі новыя перадавыя тэхналогіі, пашыраў віды паслуг. Пад кіраўніцтвам Івана Паўлавіча прадпрыемства дасягнула высокіх эканамічных і вытворчых паказчыкаў. Паспяховае ў савецкі час прадпрыемства, якое два гады запар займала першае месца ва Усесаюзным

спаборніцтве, вытрымала выпрабаванне часам, ператварылася ў сучасны завод, адзін з асноўных пастаўшчыкоў Мінскага трактарнага завода.

Спецыялізацыя Кобрынскага завода аграпрамысловага машынабудавання – вытворча-тэхнічнае абслугоўванне суб’ектаў аграпрамысловага комплексу, выраб дэталяў да трактараў маркі «Беларус». У структуры прадпрыемства цэх па вытворчасці правадоў і жгутоў правадоў для аўтатрактарнага электраабсталявання і цэх механічнай апрацоўкі. Працуе дылерскі цэнтр па рэалізацыі ўсіх мадэляў трактароў вытворчасці ВА «МТЗ», іх перадпродажнаму, гарантыйнаму і паслягарантыйнаму абслугоўванню; кіслародная станцыя.

Кобрынскі завод з’яўляўся лепшым пастаўшчыком ВА «МТЗ» (2002), лепшым дылерам МТЗ (2003, 2005), пераможцам абласнога конкурсу ў вобласці якасці прадукцыі (2006). Прадукцыя завода экспартавалася ў краіны СНД, Літву.

Паспяваў Іван Паўлавіч займацца і грамадскай дзейнасцю. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога і Кобрынскага раённага Саветаў дэпутатаў, быў удзельнікам чатырох Усебеларускіх народных сходаў.

За сваю працоўную дзейнасць, прафесіяналізм І. П. Мароз адзначаўся на самым высокім узроўні. Узнагароджаны ордэнамі Пашаны (1999), Айчыны III ступені (2004), медалямі «За працоўную доблесць» (1987), «Ветэран працы» (1989). Па выніках працы за 2007 год занесены на раённую Галерэю Працоўнай Славы раёна ў прамысловасці.

Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў № 37 ад 13 студзеня 2015 года за асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна Івану Паўлавічу Марозу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

Сёння І. П. Мароз знаходзіцца на заслужаным адпачынку. Іван Паўлавіч заўсёды жыў насычаным жыццём: займаўся спортам, танцамі (выступаў нават на сцэне Крамлёўскага Палаца з'ездаў), садоўніцтвам і пчалярствам. І зараз ветэран знаходзіць справы па душы. Сапраўднай аддушынай для яго з'яўляецца магчымасць адпачыць на дачы. З выхадам на пенсію ён прысвяціў сябе любімаму захапленню – пчалярству. Любоў да малой радзімы, сям'і, людзей, жыццялюбства, мэтанакіраванасць – стрыжань гэтага чалавека.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Мороз Иван Павлович** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 239.

**Мароз Іван Паўлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – 2-е выд., дап. – Кобрын, 2020. – 53-54 с. : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Мароз Іван Паўлавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 62-63 : фат.

**80 гадоў** з дня нараджэння І. П. Мароза (1945) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 174.

**Мороз, И. П**. Кобринский завод агропромышленного машиностроения / И. П. Мороз // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. - Минск, 2009. - Т. 1, кн. 1. - С. 470.

**Заламай, У. А.** Час выбраў нас : да 60-годдзя ўтварэння Брэсцкай вобласці / Уладзімір Аляксандравіч Заламай. – Брэст, 1999. – 47 с. ; фат.

Гл. на с. 5.

**Бакун, Е.** Почему мед жидкий, или Как выбрать настоящий натуральный продукт? / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2024. – 7 верасня (№36). – С. 16 : фот.

Иван Мороз, Почетный гражданин Кобринского района, ветеран труда, с выходом на пенсию посвятил себя пчеловодству.

**Бакун, Е.** Жить — значит трудиться / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 29 ліпеня (№ 52). — С. 7 : фот.

О жизненном пути почетного гражданина кобринского края Ивана Павловича Мороза.

**Курачук, С.** История кобринского края в лицах : [Почётный гражданин Кобринского района. М. Н. Клочкович, В. Г. Кузич, И. П. Мороз] / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 29 июля (№ 30). – С. 4. – Продолжение. Начало в № 12, № 17, № 21, № 25.

**Савчук, М.** Иван Мороз: «Скучать мне не приходится» / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2020. – 2 июля. – С. 4.

Почетный гражданин Кобринского района, бывший директор ОАО «Кобринагромаш» И. П. Мороз, находясь на пенсии, занимается садоводством и пчеловодством.

**Курачук, С.** Достойным - почётное звание! / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2018. – 6 декабря (№ 49). – С. 4.

**Кузина, С.** Навечно сохраним / Светлана Кузина // Кобрынскі веснік. - 2018. – 6 кастрычніка. - С. 4.

Почетный гражданин Кобринского района И. Мороз подарил архиву свои документы.

**Бакун, Е.** Где дело само за себя говорит / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 5 красавіка. - С. 5.

Почетный гражданин Кобринского района И. П. Мороз прошел путь от рядового техника-механика до управляющего предприятия.

**Лесик, И.** Союз оказался прочным / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. – 2015. – 14 студзеня. – С. 4.

Заслуги И. П. Мороза, 28 лет руководившего коллективом ОАО «Кобринагромаш», отмечены орденом, медалями и уважением коллег.

**Савчук, М.** Трудовой стаж длиной в полвека / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2015. - 5 февраля. - С. 4.

Трудовой путь И. П. Мороза, 28 лет возглавлявшего коллектив сельхозтехники, отмечен званием «Почетный гражданин Кобринского района».

**Сталі** грамадзянамі. Ганаровымі // Народная трыбуна. – 2015. – 23 студзеня. – С. 3.

Звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» ўдастоены Марыя Клачковіч, Уладзімір Кузіч і Іван Мароз.

**Бурдыка, В.** "Бермудскі" трохвугольнік дырэктара ААТ "Кобрынаграмаш" Івана Мароза / Вячаслаў Бурдыка // Народная трыбуна. - 2012. - 27 ліпеня. - С. 10.

**Мароз, І.** «Гораду патрэбна наша праца» / Іван Мароз // Кобрынскі веснік. – 2012. – 21 ліпеня. – С. 4.

**Мороз, И.** Многовекторность как фактор стабильности / [Иван Мороз ; беседовал] Юрий Бехтерев // Директор. – 2011. – 30 мая.

Интервью с директором ОАО «Кобринагромаш» Иваном Морозом.

**Мельнік, Р.** Іван Мароз: «Я заўсёды жыву праблемамі вёскі» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2010. – 24 лютага. – С. 2.

**Мароз, І. П.** "На дзяржаву разлічвай - але і сам не лянуйся" / Іван Паўлавіч Мароз ; [гутарыў] Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 10 лістапада. - С. 1.

**Мороз, И.** «Нынешний финансовый кризис по сравнению с началом 90-х - мелочи» / Иван Павлович Мороз ; [беседовал] Сергей Волков // Заря. - 2010. - 27 марта. - С. 3.

**Бурдыка, В.** Дырэктар верыць у поспех, а калектыў – у дырэктара / Вячаслаў Бурдыка // Народная трыбуна. - 2006. - 2 снежня. - С. 1, 2.

20 гадоў таму І. П. Мароз узначаліў Кобрынскую райсельгастэхніку – і на прадпрыемстве адбыліся вялікія перамены.

**Сацук, А.** Треугольник успеха / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. – 2006. – 27 верасня. – С. 1, 2.

Более 20 лет возглавляет ОАО «Кобринский завод агропромышленного машиностроения» Иван Павлович Мороз.

**А у нас** такой земляк! // Кобрынскі веснік. – 2005. – 6 студзеня.

Директор ОАО «Кобринагромаш» И. П. Мороз награжден орденом Отечества III степени.

**Кобрынскі раён**
**Кобрын**
**Свішчы**
**«Кобрынаграмаш» ААТ**
**Мароз Іван Паўлавіч**
**Ганаровыя грамадзяне**
**Дырэктары**